# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА М. Я. НАГІБАВА



**М. Я. Нагібаў, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – сакавік 1944 г.

**Месца дзеяння:**

раён Гарадоцкіх вуліц г. Віцебска

**Колькасць:**

25 чалавек

**Кіраўнікі:**

Нагібаў Мікалай Якаўлевіч («Смелы»)

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да сакавіка 1944 г. Аб'ядноўвала 25 чалавек. Кіраўнік М. Я. Нагібаў («Смелы»). У групу ўваходзілі: Т. С. Шчукіна (намеснік кіраўніка, «Сціплая»), А. Т. Граўжынас, С. Ф. Дарагінскі, М. Д. Зайцаў, В. І. Індрушонак (Кірыленка), І. Л. і С. І. Калініны, А. В. Кавалёў, У. М. Лазука, В. М. Лісіцкая, Н. І. Міхайлоўская, М. Г. Навасельскі, А. Пятроў, З. Ц. Піроժнікава, І. А. і М. М. Табуновы, А. Н. і Н. Ф. Цярэнцьевы, У. М. і Я. І. Тычыніны, Я. І. Хмялёў, У. П. Шарцаў, А. Р. і Я. А. Юшчанкі.

З першых дзён акупацыі Віцебска члены групы збіралі зброю, узрыўчатку, вялі разведку, наладжвалі і ўмацоўвалі сувязь з жыхарамі горада. На канспіратыўнай кватэры Тычынінай (вуліца 17-я Гарадоцкая, 6) Нагібаў арганізаваў навучанне падпольшчыкаў мінна-падрыўной справе. Вясной 1942 г. удзельнікі падполля наладзілі сувязь з 1-ай Беларускай партызанскай брыгадай і адказным арганізатарам Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б па горадзе В. Р. Кудзінавым. Патрыёты ахапілі разведкай амаль увесь фашысцкі гарнізон, ажыццяўлялі дыверсіі на чыгуначным вузле, лініях Віцебск – Гарадок, Віцебск – Полацк. Толькі за кастрычнік – снежань 1942 г. на чыгунцы разбіты 3 паравозы, 39 вагонаў, 36 цыстэрн з бензінам, узарваны шашэйны мост у раёне чыгуначнай станцыі Залучча. У кастрычніку 1942 г. у прыгарадзе Віцебска Нагібаў і Шчукіна падарвалі цягнік і 22 вагоны. У ноч на 26 лістапада група пусціла пад адхон 2 ваенныя эшалоны, у снежні – паравоз і 12 вагонаў.

Група ўзаемадзейнічала з падпольнымі групамі Ф. К. Мехава – А. А. Гагулі, П. С. Смірнова, М. А. Ляхоўскага, перадавала партызанам і армейскім разведгрупам каштоўныя звесткі, ажыццяўляла сувязь з падпольным гаркамам партыі, праводзіла ў тыл праціўніка армейскіх разведчыкаў, давала ім свае базы.

З 18 лістапада да 4 снежня 1943 г. патрыёты разам з савецкімі танкістамі і іншымі падпольшчыкамі трымалі абарону на ўчастку вёсак Цыганы – Малыя Стайкі Гарадоцкага раёна, у выніку знішчылі 20 гітлераўцаў і іх памагатых, 19 захапілі ў палон. Дзейнічала да злучэння з часцямі Чырвонай арміі.

М. Я. Нагібаў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені, Т. С. Шчукіна, З. Ц. Піроժнікава і У. М. Лазука – ордэнам Чырвонай Зоркі, 6 чалавек – медалямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група М. Я. Нагібава / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.:

Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 494–495.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Нагібава М. Я. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131.

3. **Подпольная** группа Нагибова Н. Я. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 293.